он остается основой основ, и на преподавание его необходимо обращать очень пристальное внимание [5].

---

1. Базарова, Н.П. Классический танец / Н.П. Базарова. – М. : Искусство, 1975. – 204 с.

2. Белов, М. Эстетическое воспитание средствами хореографического искусства [Текст] / М. Белов. – М. : Сфера, – 2001. – 46 с.

3. Богаткова, Л.Н. Танцы для детей : с метод. пояснениями / Л.Н. Багаткова. – М. : Детгиз, – 1959. – 381 с.

4. Ваганова, А.Я. Основы классического танца / А.Я. Ваганова. – С-Пб. : Искусство, –2002. –192 с.

5. Мориц, В. Методика классического тренажа / В. Мориц, Н. Тарасов, А. Чекрыгин. – М. : Искусство, –1940. – 237 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мунасыпава С.Р.,** студ. 320 н гр.
Навуковы кіраўнік – Гуткоўская С.В.

## ХАРЭАГРАФІЯ ЯК НЕАД'ЕМНАЯ ЧАСТКА ВЯСЕЛЬНЫХ АБРАДАЎ БЕЛАРУСАЎ

Беларускае вяселле – гэта не толькі прыгожае свята, але і складаны рытуал. Вяселле нагадвала своеасаблівы спектакль, дзе можна было ўбачыць сапраўдную прыгажосць народных звычаяў, і дзе, разам з тым, надзвычай ярка раскрывалася душа народа, яго псіхалогія. Вясельная абраднасць давала яскравае ўяўленне пра розныя бакі народнага быту

беларусаў, іх характарныя вераванні, маральныя, этнічныя і эстэтычныя погляды [3].

«Фальклор вясельны ўяўляе сабой сукупнасць славесных, драматычных, музычных, харэаграфічных, славесна-музычных твораў і з'яўляецца арганічнай часткай традыцыйнага ўсходнеславянскага вясельнага абрада. Вясельны фальклор ўключаў песні, галашэнні, загаворы; прысуды і гаворкі свата, дружкі; паэтычныя пажаданні, выказваемыя роднымі жаніха і нявесты, вясельнымі гасцямі пры адорванні маладых; драматычныя сцэнкі з пераапрананнем; гульні ў "цыган", "доктара", "жаніха і нявесту", "ксяндза" і інш.» [1, с. 284–289].

Пра характэрную асаблівасць беларускага вяселля гаворыць ужо сама назва, вяселле – ад слова «весела». І сапраўды, на вяселлі не змаўкалі песні, музыка, жарты, віншаванні і пажаданні, не спыняліся танцы, тэатралізаваныя сцэнкі і г.д. Яно і зразумела: жаніцьба – важная, асаблівая падзея ў жыцці чалавека. Гэта пачатак яго новага, самастойнага жыцця. Уступленне маладых людзей у шлюб – незабыўнае свята як для іх, так і для ўсей сям'і, сваякоў, суседзяў. Усе звесткі, запісаныя пра гэтае свята і раскіданыя па розных пісьмовых крыніцах: беларускіх летапісах, мемуарах розных асоб, творах мастацкай літаратуры і іншых, пачалі з'яўляцца толькі з XIX ст. Вяселле падзялялася на тры асноўныя часткі: 1. давясельную (выглядзіны, даведкі, сватанне, заручыны, запоіны); 2. вясельную (суборная субота, каравай, пасад, шлюб, камора, завіванне маладой, падзел каравая і інш. ); 3 . паслявясельную (пярэзвы) [1]. Другая частка была самай працяглай па часе. Госці віншавалі маладых, выпівалі за іх шчаслівае сямейнае жыцце, спявалі розныя песні, у тым ліку песні-дражнілкі маладым і іх роду [1].

Менавіта на вяселлі выконваліся розныя танцы, у якіх ухвалялі жаніха і нявесту. Акрамя таго, часта выкарыстоўваліся імправізацыйныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

харэаграфічныя элементы. Пад імправізацыяй тут разумеецца складанне фальклорнага твору ў момант выканання, без папярэдняй падрыхтоўкі ці змяненне асобных яго частак, вобразаў, інтанацыйнага ладу [4]. Асаблівы настрой гасцям стваралі музыканты, якія падыгрывалі спевакам мелодыі адпаведных песен або выклікалі іх на танец вяселым россыпам мелодый гармоніка, бубна, скрыпкі, цымбал і некаторых іншых народных інструментаў [1].

У кнізе аўтараў Т.Б. Вафаламеевай, В.І. Басько, М.А. Козенка «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» прыводзяца прыклады танцаў, якія да сеняшняга дня захаваліся ў беларусаў як неад’емная частка вясельных і іншых сямейных абрадаў і застолляў. Сярод іх *«Ляваніха», «Полька», «Нарэчанька», «Венгерка», «Вальс», «Сяменаўна”, «Сербіянка», «Падыспань», «Кракавяк», «Карапет»* і многія іншыя народныя танцы [2]. Напрыклад, у дзень чыйго-небудзь вяселля госці танцуюсь перад хатай на вуліцы. Ні адно вяселле не абыходзілася без гармоніка і барабана [2].

Цікавасть для нас прадстаўляе апісанне ўзаемадзеяння і ўзаемаадносін музыкі і танца, выконваемых пад час вяселля. Так, у кнізе Міхала Федароўскага «Люд Беларускі. Вяселле» апісана, што было ў даўнія часы ў жывым бытаванні. «Пасля разнастайных вітальных прыпевак скрыпач уцінае па струнах жвавага “Шарлатана”, а моладзь, ахвотна прытупваючы, ідзе танцаваць. Толькі што згаданы *“Шарлатан”* з’яўляуцца нічым іншым, як мелодыяй марша Дамброўскага. У “Шарлатане” ўдзельнічаюць тры асобы, з іх двое стаяць каля сцен адзін насупраць другога, трэці ж танцор, пакуль музыкант грае павольнейшым тэмпам, падбягае, танцуючы, то да аднаго, то да другога; калі ж музыкант зайграе жвавей, тады сярэдні танцор, хутка падскокваючы, падхоплівае ў круг аднаго, потым падбягае да другога, выгукваючы: ”Віват! Наша!”. У час танца ён левай рукой падымаў ўверх шапку» [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апрача «Шарлатана», звычайна танцавалі *«Польку»*, *«Аколушку»*, *«Барыньку»*, *«Казака»*, *«Шуфлядку»* і *«Падушачкі»*. Каб станцаваць «Падушачкі», станавіліся больш за дзесятак асоб, утвараючы вялікае кола, у сярэдзіне якога знаходзіўся адзін з танцораў. Як толькі музыка зайграе, танцоры, трымаючыся за рукі, скакалі ўсім колам, спяваючы:

*«Падушачкі, падушачкі,*
*Да ўсе пухавыя,*
*Малодачкі, малодачкі,*
*Да ўсе маладыя.*
*Каго люблю, каго люблю,*
*Таго пацалую,*
*Падушачку пухавую*
*Таму падарую»*

«Як толькі праспявалі песню тройчы, танцор, што быў ў сярэдзіне, хапаў першую – лепшую дзяўчыну з кола, іншыя робяць тое самае; той жа, хто аставаўся без пары, павінен быў ісці ў сярэдзіну і г. д.» [3, с. 23–26]. У гэтай крыніцы мы знаходзім таксама апісанні танцаў *«Вечаруха» і «Калодачка»*. У некатарых вёсках перад вяселлем жаніх і нявеста разам са сваімі сябрамі спраўлялі развітальны вечар – «вечаруху» («вянок», «дзявічкі»). Як толькі маладыя заходзілі у хату, ўсе прысутныя там дзяўчаты станавіліся ў кола разам з імі і пачыналі спявать вясельныя песні. Пасля спеваў танцавалі, потым зноў спявалі да таго часу, пакуль не разжалабяць навесту, і яна не пачне плакать.

Танец *«Калодачка»*, звесткі аб якім былі сабраны ў в. Бяседавічы Хоцімскага раена ад інфарматара Матроны Чыбусавай, па яе сцвярджэнню, танцавалі менавіта на вяселлі. «Выконвалі яго частей за ўсе ад трох да шасці чалавек. Абявязковым атрыбутам танца была невялічкая хусцінка. Вакол асобы, якая яе трымала, групаваліся ўдзельнікі танца. На

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сярэдзіну покоя ў адзін з вяселых момантаў “свадзьбы” выходзіла “завадатарка” і уздымала ў бок правую рукуз хусцінкай. Жанчыны, што малі намер танцаваць, становіліся за ею па колу на роўнай адлегласці адна ад адной, уздымалі правыя рукі ў бок і злучалі іх з узнятай рукой завадатаркі. Левыя рукі ў адвольнай паставе апускаліся ўніз або былі пакладзены далонямі (ці кулачкамі) на талію» [3].

«Самы любімы танец і ў молодзі, і ў пажылых людзей быў *«Цыганачка»* ці *«Сербіянка»*. Хто-небудзь з найбольш баявых дзяўчат ці жанчын выходзіў ў цэнтр і прасіў гарманіста сыграць “Сербіянку”. За ей выходзілі ўсе астатнія, і танец не прыпыняўся да таго часу, пакуль танцуючыя не праспяваюсь усіх частушак, якія ведалі. Гарманіст не адложыць гармонік да таго часу, пакуль самі танцоры не папросяць аб гэтым. Моладзь са здавальненнем танцавала і вальс, і польку. Жаніху з нявестай уступалі месца у крузе» [1, с. 162–164].

Усе танцы на вяселлі лічыліся *абрадавымі скокамі*, якія выконвалі ўдзельнікі вяселля на пэўных яго этапах. Часцей за ўсе вяселле адкрывалася пачынальным вясельным танцам маці маладога. Пасля таго, як з маладой здымалі вянок (дружкі па чарзе прымяралі яго і скакалі, паказваючы свае жаданне хутчэй выйці замуж) і завівалі галаву наміткай, усе прысутныя, узяўшыся рукамі за доўгі ручнік, скакалі па лаўках. Танец гэты называлі «Скакуха», яго часам узначальвалі малады з маладой. Пасля цешчынага пачастунку, ен павінен быў выконваць з ею пад музыку дудара танец, які называлі *«Пляс»*, або *«Казак»* (Гарадоцкі павет) [3].

Часта на вяселлі выконвалі карагоды, якія прымяркоўваліся менавіта да гэтай падзеі. Напрылад, у Гарадоцкім павеце ў суборную суботу, пасля віцця вянка, маладая ўтварала са своіх сябровак карагод і вяла яго на ручніку ў хату, дзе іграў дудар. Карагод таксама вадзілі пасля шлюбнага застолля ў доме маладой, на двары пасля абраду каморы. Карагод на двары

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вадзілі і каравайніцы, пасадзіўшы каравай у печ, а таксама на працягу ўсіх іншых дзеянняў, якімі суправаджалася выпяканне каравая. У гэтычас усе скокі суправаджаліся даволі выразнымі рухамі цела, якія насілі сімвалічны характар. У канцы вяселля карагодам ішлі у карчму, каб працягваць вяселле. Пазней многія рытуальныя вясельныя танцы значна спрасціліся і выступалі у выглядзе трохразавага кружэння [3].

Прааналізаваўшы ўсю сабраную інфармацыю, можна ўмоўна вылучыць некалькі відаў танцаў, якія выконваліся на вяселлі:

- *абрадавыя скокі;*
- *традыцыйныя танцы;*
- *гарадскія-бытавыя танцы.*

Акрамя таго, значную частку займалі танцы імправізацыйнага характару. Такім чынам, харэаграфія з'яўляецца неад'емнай і важнай часткай вясельнага абраду.

---

1. Вафаламеева, Т.Б. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў / Т.Б. Вафаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 335 с.

2. Восточнословянский фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / редкол.: К.П. Кабашников (отв. ред.) и др. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

3. Касцюкавец, Л.П. Беларускія народныя абрады / Л.П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – 569 с.

4. Мажэйка, З.Я. Песні беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 392 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ